**Кіёскі самастойнай рэгістрацыі**

Рэгістрацыя з дапамогай кіёскаў вельмі простая і не займае шмат часу. У Нацыянальным аэрапорце Мінск у кіёсках самарэгістрацыі праводзіцца рэгістрацыя пасажыраў рэйсаў авіякампаніі «Белавія». Кіёскі размешчаны на 3 паверсе аэравакзальнага комплексу перад стойкамі рэгістрацыі пасажыраў.
Падрыхтуйце:

- пашпарт;
- данныя кода (нумара) браніравання або нумара авіябілета;
- бонусную картку авіякампаніі (пры наяўнасці).

Далей выконвайце ўказанні на экране кіёска самастойнай рэгістрацыі. Пасля завяршэння рэгістрацыі кіёск выдасць вам пасадачны талон.
Пасажыры, якія падарожнічаюць з багажом і зарэгістраваліся на рэйс з дапамогай кіёска, могуць здаць свой багаж не пазней часу заканчэння рэгістрацыі на стойках рэгістрацыі.